Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 21 (673) ПЯТНІЦА, 9 чэрвеня 1967 г. Цана 2 кап. Год выдання XX



*Адзін з момантаў звычайных будняў студэнтаў у гэтыя дні. Рашаюцца задачы, выводзяцца формулы. Наперадзе экзамен. Трэба ведаць усё. Інакш нельга.*

*Фота А. КАДЗЕТА.*

## ДАКАЗАНА ПРАКТЫКАЙ

Здача экзаменаў — гэта праверка вынікаў паўгадавой, а па асобных прадметах і гадавой працы. Якія ж паказчыкі першых экзаменаў па палітычнай эканоміі?

Трэба адзначыць, што увогуле яны радуюць як выкладчыкаў, так і студэнтаў. З агульнай колькасці здаўшых экзамен фізікаў трэцяга курса 152 атрымалі выдатна, што складае 34,2 працэнты агульнай колькасці, на добра—39,4 працэнты, на здавальняюча — 23,7. Нездавальняючыя адзнакі атрымала толькі 2,7 працэнты.

Як паказала практыка, добрых поспехаў дабіліся тыя студэнты, якія працавалі на працягу ўсяго працоўнага семестра, добрасумленна рыхтаваліся да семінарскіх заняткаў, актыўна выступалі на іх. З 24 чалавек адзінаццатай групы трэцяга курса фізфака, здаўшых палітычную эканомію, дваццаць атрымалі на экзамене той бал, на які ацаніў іх паспяховасць выкладчык за семестр. І толькі ў чацвярых былі адхіленні.

Але і сярод паспяваючых у навучальным годзе бываюць зрывы, якія нельга нічым апраўдаць, акрамя безадказных адносін да экзаменаў. Апошняе вельмі турбуе выкладчыка. Добра паспяваў на працягу года студэнт трэцяга курса гэтага факультэта Н. Елісееў. Аднак на экзамене не змог падняцца вышэй «здавальняюча». Але па жаданню ўжо праз чатыры дні прыйшоў і пераздаў на «добра». Падобнае становішча наглядаецца і на хімічным факультэце. На працягу года на выдатна вучыліся студэнткі трэцяга курса Т. Прыбыткова, Г. Красоўская. Але на экзамене выкладчык змог ацаніць іх адказы толькі на здавальняюча. Праўда, яны пераздавалі. Але факт застаецца фактам.

У цэлым студэнты трох груп, якія здавалі ўжо экзамен, паказалі глыбокія веды курса палітычнай эканоміі. З васьмідзесяці чалавек на выдатна здалі 31,2 працэнты, на добра — 51,2 працэнты, астатнія атрымалі здавальняючыя адзнакі. Вельмі добра адказвалі на экзамене студэнты Т. Прамушка, М. Вайжакян, З. Шчэмер і шмат іншых, карацей, тыя, хто старанна працаваў на працягу года.

М. БАЗЫЛЕЎ,
асістэнт кафедры палітэканоміі.

## ЭКЗАМЕН — ПРАФІЛІРУЮЧЫ

Экзамен па сінтаксісу беларускай мовы для студэнтаў III курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта з'яўляецца важнейшым: ён прафіліруючы. І гэта добра разумеюць самі студэнты. У школе, дзе ім прыдзецца настаўнічаць, дасканалае веданне роднай мовы — першая неабходнасць. Можа таму і на экзамене, які прымаў старшы выкладчык М. Дз. Міхей, вынікі былі паспяховымі. Студэнты паказалі добрае веданне як практычнага так і тэарэтычнага матэрыялу. Экзамен здавалі дзве групы, першая і трэцяя. З гэтых груп асабліва адказна падышлі да экзамену студэнты А. Жоўнер, Р. Букоўская, А. Кот, Л. Судак, О. Аўсіевіч, Г. Завадская і многія іншыя.

## БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ

Год пяцідзесяты. Год юбілейны. Яго крокі відаць паўсюдна: і ў небывалым развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі. І асабліва культуры. Да кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі нават гутаркі не вялося аб адкрыцці аспірантуры ў Беларусі. Была толькі адна вышэйшая навучальная ўстанова, дый тая мізэрных памераў. А цяпер у адной толькі аспірантуры універсітэта каля 400 аспірантаў стацыянарнага і завочнага навучання. Але і гэта не ўсё. Камуністычная партыя. Савецкі ўрад клапаціліся аб тым, каб стварыць усе неабходныя ўмовы для падрыхтоўкі вучоных і шляхам здачы кандыдацкага мінімума і напісання кандыдацкіх дысертацый экстэрнам, без адрыву ад вытворчасці.

Зачынальнікам гэтай карыснай справы на Беларусі стаў наш ардэнаносны універсітэт. Пры аспірантуры БДУ — 900 спаборнікаў. Характэрна, што знаходзяцца яны не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі.

Нядаўна вялікая група спаборнікаў здавала экзамен па курсу марксісцка-ленінскай філасофіі, дзе паказалі нядрэнныя веды. З пяцідзесяці пяці чалавек шаснаццаць здалі на выдатна і толькі тры атрымалі нездавальняючыя адзнакі.



*Сесія неяк яшчэ больш збліжае студэнтаў. Хто ведае, можа гэты юнак і дзяўчына на выдатна здадуць сесію і шчыра, па-юнацку пакахаюць адзін аднаго...*

*Фота А. КАДЗЕТА.*

## НА ПАДЛІКУ ПЯЦЁРКІ

Радуюць поспехі трэцякурснікаў гістарычнага факультэта. Сесія — добры сведак таго, як студэнты рыхтаваліся на працягу вучэбнага года.

Напісаны курсавыя работы па спецпрадмету. Тэмы іх — самыя разнастайныя. Большасць выканала іх своечасова. А. Аляксеенка і Е. Брыгадзір канкрэтна, змястоўна раскрылі тэмы. Апрача гэтага, мова і стыль адпавядае ўсім запатрабаванням. Заслугоўваюць увагі курсавыя работы В. Вяроўкінай, Н. Кунцэвіч. Усе яны атрымалі вышэйшыя адзнакі — выдатна.

Характрна тое, што А. Аляксеенка і Е. Брыгадзір таксама на выдатна здаюць экзамены і па іншых дысцыплінах. Цяпер яны рыхтуюцца да здачы экзаменаў па гісторыі СССР, гісторыі Азіі і Афрыкі.

Не адстаюць ад іх і першакурснікі. Выдатныя адзнакі атрымалі за курсавыя работы студэнты І. Міхальчанка, Н. Латыш, В. Кушнір, М. Зайцаў, М. Белавус, В. Валаводскі.

Ёсць усе надзеі меркаваць, што наступныя экзамены па гісторыі БССР і асновах архіялогіі яны здадуць не горш.

Наогул, студэнты першага курса гістарычнага факультэта ўзялі добры старт яшчэ ў зімовую сесію і прадоўжаць яго цяпер — у летнюю. Многія з іх — будучыя цалінныя.

Сваімі добрасумленнымі поспехамі ў вучобе яны ўносяць багаты ўклад у скарбонку працоўных будняў факультэта.

І. МЯДЗВЕДЗЕЎ.

## «БАЙЦЫ» ШТУРМУЮЦЬ ДРУГІ СЕМЕСТР

Яны адклалі кніжкі ўбок.

— Пеця, як у цябе з атрадам справы:

— Укамплектаваны. Вось толькі з майстрам справы дрэнныя. Трэба звязацца з політэхнічным, з будфакам.

Так яны размаўляюць доўга, Алег Слука, Пятро Пабока, Валодзя Вялічка. Першыя два — камандзіры цалінных атрадаў філфака. Валодзя —памочнік камандзіра рэспубліканскага студэнцкага будаўнічага атрада. Трэба размеркаваць сілы, каб ужо па прыездзе ва Уральскую вобласць кожны быў асвядомлены ў сваіх абавязках.

Спачатку здаецца, што ў іх у галаве толькі адна цаліна, але гэта толькі здаецца. Асноўнае, аб чым ім прыходзіцца думаць зараз—гэта сесія.

І вось апошні экзамен — гісторыя замежнай літаратуры XX стагоддзя. Курс вельмі вялікі. Патрэбна прачытаць дзесяткі тысяч старонак твораў французскай, англійскай, нямецкай, амерыканскай, чэшскай, польскай і многіх іншых літаратур. І яны адолелі, гэтыя дзесяткі тысяч. Справа, вядома, нялёгкая. Нават некаторыя студэнты скардзяцца, што да гэтага часу не перастаюць балець вочы ад чытання.

Цяпер трэцякурснікі-журналісты збіраюцца на цаліну, дзеляцца ўражаннямі аб прайшоўшым экзамене. Як прыемна ўбачыць у залікоўцы выдатную адзнаку. Таму так задаволены Федзя Кулакоў. Ну і «добра» ёсць добра. Хіба гэтым нельга не ганарыцца. Такая адзнака ў Алега і Уладзіміра, пра якіх мы ўжо гаварылі. Адным словам, не станем пералічваць усіх. Галоўнае, што цалліннікі і на гэты раз правялі экзамен па-ударнаму, або, як кажуць, па-цаліннаму. Праўда, іх радасць азмрочвае сум. Гэта таму, што некаторыя з іх «завалілі». У цалліннікаў такі закон: адзін за ўсіх і ўсе за аднаго. Калі няўдача напаткала аднаго — гэта з'яўляецца няўдачай для ўсіх.

Сесія закончана. І зноў, калі нам прыходзіцца заглянуць у пакой 295 інтэрната, што знаходзіцца па Паркавай магістралі, мы бачым гэтых жа хлопцаў. Яны сядзяць за «круглым» сталом і вядуць спрэчкі. Зноў пра цаліну, зноў Алег Слука, Пятро Пабока і Уладзімір Вялічка. Каля іх — цалліннікі Віктар Захарчук, Вечыслаў Дашкевіч і іншыя. Так і трэба, — агульныя справы вырашаць гуртам.

Неўзабаве настане час ад'езду цалліннікаў універсітэта ў бяскрайнія казахстанскія прасторы. А стэпы іх ужо чакаюць —слаўных, працавітых, вясёлых.

У рэдакцыю прыходзяць пісьмы з фізічнага, матэматычнага і іншых факультэтаў, у якіх студэнты-цалліннікі пішуць пра свае поспехі ў вучобе, і, галоўнае, у кожным пісьме яны запаўняюць, што працаваць у працоўным семестры—67 будуць яшчэ лепш, чым у мінулым годзе.

Гэта вельмі радуе. Такая запэўненасць не пакідае ў душы ні кроплі сумнення. Наадварот. Толькі ўпэўненасць. Толькі ўпэўненасць.

А. ЦЕРАХОВІЧ.